Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

7 ЖНІЎНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 149 (28007) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Пра будучыню беларускай энергетыкі**

СТАР. 13



**Еўракубкавая восень будзе!**

СТАР. 15



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## *ЛІЧБА ДНЯ*

## 90,8 кг

*золата ў злітках прадаў Нацыянальны банк Беларусі сёлета за студзень—ліпень. Назад выкупіў — каля 54,1 кг. За сем месяцаў Нацбанк рэалізаваў 9 тысяч 797 залатых зліткаў. Найбольшым попытам у беларусаў карысталіся 1-, 5- і 10-грамовыя. Назад выкуплена 2 тысячы 108 залатых зліткаў. Серабра за студзень—ліпень прададзена больш за 48,4 кг (1 тысяча 259 зліткаў), выкуплена назад каля 29,1 кг. Плаціны беларусы купілі 309 г, а прадалі назад Нацбанку 759 г.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.08.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15707,00 | ▲ |
| Еўра | 17119,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 246,12 | ▼ |
| Укр. грыўня | 725,50 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Летняя матывацыя

# Адпачынак на любы густ

### Яшчэ ў чэрвені стартавала новая рэспубліканская акцыя «Лета — на карысць»

**«Мы мелі на мэце падчас летняй аздараўленчай кампаніі пашырыць пералік профільных лагераў для высокаматываваных дзяцей», — паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК. У розных рэгіёнах краіны сёлета дзейнічаюць экалагічныя, біялагічныя, тэхнічныя, матэматычныя, грамадска-гуманітарныя, мастацкія, харэаграфічныя, ваенна-патрыятычныя, абаронна-спартыўныя, турыстычныя летнікі, лагеры для актывістаў грамадскіх арганізацый.**

У апошні час з'явілася тэндэнцыя да павелічэння колькасці так званых лінгвістычных летнікаў, якія адкрываюцца найперш разам з асацыяцыяй клубаў ЮНЕСКА і іншымі арганізацыямі. Сёлета, напрыклад, у Асіповіцкім раёне з'явіўся лагер юных археолагаў. Адкрываюцца таксама спецыялізаваныя летнікі для юных паэтаў, энтамолагаў і г.д. Цікавым напрамкам дзейнасці профільных лагераў з'яўляецца стварэнне валанцёрскіх педагагічных атрадаў для падлеткаў, якія маюць схільнасці да педагагічнай дзейнасці. У такіх валанцёрскіх атрадах толькі ў НДЦ «Зубраня» ўдзельнічаюць каля 50 хлопчыкаў і дзяўчат. А за два летнія месяцы ўжо 200 старшакласнікаў з задавальненнем акунуліся ў валанцёрскую працу. Прыкметна павялічылася колькасць лагераў працы і адпачынку. Сёлета праз такія летнікі пройдуць каля 15 тысяч падлеткаў. Сярэдняя заработная плата ў дзяцей, якія адначасова і адпачывалі, і працавалі, склала ад 200 тысяч да 1,5 мільёна рублёў.

Цудоўна апраўдалі сябе палатачныя лагеры, якія ствараюцца па прынцыпе «летнік у летніку» — на базе стацыянарных лагераў з добра развітай інфраструктурай. Яны працуюць, як правіла, у 9-дзённым рэжыме. Шэсць профільных летнікаў з выкарыстаннем палатак арганізуюцца гэтым летам на базе Мінскага гарадскога адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Лідар». У ліпені ў «Лідары» дзейнічаў міжнародны профільны лагер: беларускіх падлеткаў знаёмілі з «азамі» рабочых прафесій нямецкія педагогі і майстры.

СТАР. 3

■ Надвор'е

# ГАРАЧЫНЯ НЕ АДСТУПАЕ



**У пятніцу, 7 жніўня, характар надвор'я істотна не зменіцца. Па-ранейшаму чакаецца паступленне вельмі цёплай паветранай масы з паўднёвага захаду Еўропы. Ападкаў не прагназуецца.**

Тэмпература паветра ўначы складзе 14-20 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе 30-34 градусы цяпла, месцамі па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да плюс 35-36 °С. Аб гэтым паведаміў **начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Гідрамета Беларусі Аляксандр БЯГАНСКІ**.

Гарачае і сухое надвор'е захаваецца ў выхадныя. У суботу ападкі не прагназуюцца. Тэмпература паветра ўначы складзе 15-22 градусы вышэй за нуль. Удзень будзе плюс 30-36 градусаў. У нядзелю таксама будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у крайніх паўночна-заходніх раёнах, з праходжаннем малаактыўнага атмасфернага фронту, магчымы кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 15-22 градусы вышэй за нуль. Удзень чакаецца плюс 30-36 градусаў.

У Гідрамеце падкрэслілі, што ў сувязі з гарачым і сухім надвор'ем на большай частцы тэрыторыі краіны пагаршаецца становішча з небяспекай пажараў у лясах, і нагадалі пра асцярожнае абыходжанне з агнём. На большай частцы тэрыторыі рэспублікі ўведзена забарона на наведванне лясоў, а да выхадных, як адзначылі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, яна будзе дзейнічаць на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

У пачатку наступнага тыдня, 10 жніўня, уначы ў некаторых раёнах магчымы кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Удзень будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе 13-20 градусаў вышэй за нуль, па поўдні — да плюс 23. Удзень будзе 27-34 градусы цяпла, па поўдні паветра прагрэецца да плюс 35-36 градусаў.

У аўторак-сераду, 11-12 жніўня, ападкаў не чакаецца. Тэмпература паветра ўначы складзе 15-22 градусы цяпла, удзень будзе 28-35 градусаў вышэй за нуль.

# БЕЗ ФАРМАЛІЗМУ

## Прэзідэнт прапануе ўзмацніць спагнанне з кіраўнікоў за дысцыпліну і парадак у калектывах

**Аб гэтым Аляксандр ЛУКАШЭНКА заявіў на нарадзе па пытанні прыняцця новай рэдакцыі Дырэктывы №1 «Аб мерах па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны», передае карэспандэнт БЕЛТА.**

Пры аналізе дзеючай Дырэктывы №1 было выяўлена, што змест дакумента не адпавядае цяперашняму ўзроўню развіцця грамадства, праблемам, якія вырашаюцца, і існуючай сітуацыі. Больш таго, частка палажэнняў Дырэктывы рэалізавана. «Дырэктыва №1 сваю ролю адыграла, і станоўчыя тэндэнцыі па многіх напрамках, якія былі прапісаны ў Дырэктыве, намеціліся», — сказаў Прэзідэнт. У прыватнасці, значна знізілася колькасць здарэнняў, звязаных з вытворчым траўматызмам. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ўзровень гібелі людзей на вытворчасці быў вельмі высокі, цяпер ён зніжаецца. Акрамя таго, скарацілася колькасць надзвычайных сітуацый і колькасць загінуўшых на пажарах людзей. Прэзідэнт адзначыў, што гэта праблема не знята, але пазітыўная тэндэнцыя відавочная. Таксама ў тры разы зменшылася колькасць загінуўшых грамадзян у выніку зніжэння ўзроўню злачыннасці. «Але, на лаўрах спачываць рана, таму што не ўсе праблемы вырашаны. Да таго ж новыя выклікі патрабуюць і адэкватнай рэакцыі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Мэта нарады, як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, у тым, каб «вызначыцца, трэба або не трэба нам новая Дырэктыва, трэба або не трэба нам удасканальваць існуючую Дырэктыву з прычыны актуальнасці гэтага пытання».

На нарадзе была заслухана пазіцыя дзяржсакратарыята Савета бяспекі, які кантралюе ход выканання Дырэктывы №1, а таксама яе непасрэдных выканаўцаў. Аляксандра Лукашэнку цікавіла, ці дастаткова будзе ўключаных у праект новай рэдакцыі Дырэктывы мер для процістаяння пагрозам бяспецы людзей, што прынцыпова новага прапануецца, што яшчэ неабходна зрабіць для аздараўлення грамадства і ўмацавання правапарадку. «Пры гэтым хачу папярэдзіць — не павінна быць у гэтых пытаннях фармалізму. У адваротным выпадку мы напішам нейкі трактат, без канкрэтыкі. Ён не будзе заземлены. Людзі яго прачытаюць, і не будуць разумець, што рабіць, якія перад імі задачы, якія праблемы і як іх вырашаць», — сказаў Прэзідэнт.

«Дакумент, калі мы яго створым, павінен быць прыземленым і канкрэтным, каб кожны кіраўнік, член урада, міністр, службовая асоба ведалі, дзе іх задачы, у якім напрамку рухацца. Пакуль мы гэтага фармалізму пазбегнуць не змаглі», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. Ён не выключыў, што і іншыя дырэктывы будуць карэкціравацца — напрыклад, аб эканамічнай бяспецы, аб дэбюракратызацыі. «Само пытанне, якое мы ўзнімаем, яго гучанне вельмі важна для грамадства. Людзі будуць разумець, што мы ўдзяляем гэтаму вялікую ўвагу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Але адным гучаннем не абыдзешся. Дырэктыва — гэта напрамкі і набор канкрэтных мер, якія мы павінны рэалізаваць у бліжэйшым будучым і ў перспектыве, каб у нас было нармальнае, жывое, здольнае выжываць грамадства», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт канстатаваў, што многія людзі не прывыклі самі клапаціцца аб сабе, аб сваім жыцці і здароўі. «Фактычна кожны трэці пацярпелы на вытворчасці атрымаў траўму або загінуў з-за асабістай халатнасці і недысцыплінаванасці. Зразумела, на кожнага работніка не паставіш «кантралёра». Разам з тым, з кіраўнікоў трэба ўзмацніць спагнанне за дысцыпліну і парадак. У рабоце некаторых з іх ёсць яшчэ і фармалізм, і бяздушнасць, і халатнасць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Больш строгага падыходу, на думку Прэзідэнта, патрабуе і праблема бытавога п'янства. Паколькі трэць злачынстваў учыняецца ў стане алкагольнага ап'янення. Ад хвароб, звязаных з ужываннем алкаголю, штогод памірае каля 3 тыс. чалавек, з іх не менш як 2 тыс. у працаздольным узросце, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Сур'ёзнай праблемай апошнім часам становіцца наркаманія, ад якой гінуць людзі, у большасці — моладзь. Гэта пагроза генафонду нацыі, адзначыў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што па гэтым пытанні прымаліся канкрэтныя рашэнні, і па выніках года будзе разгледжана, як яны выконваюцца.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што на лячэнне ад алкагалізму, наркаманіі і курэння траціцца значныя бюджэтныя сродкі. Дзяржава нясе вялікія эканамічныя страты ад усіх пералічаных негатыўных з'яў, дадаў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што парадак, дысцыпліна, самасвядомасць павінны прысутнічаць ва ўсіх калектывах. «І перш за ўсё, у думках і душах людзей. Трэба прывіваць чалавеку культуру паводзін, што не дапускае разгільдзяйства і п'янства. Гэта работа павінна праводзіцца бесперапынна і мэтанакіравана», — запатрабаваў кіраўнік дзяржавы.

# ЖЫЦЬ СЁННЯ

## Аляксандр Лукашэнка патрабуе выканання ў поўным аб'ёме запланаваных на сёлета паказчыкаў

**Такую задачу ён паставіў перад урадам, прымаючы з дакладам прэм'ер-міністра краіны Андрэя КАБЯКОВА, передае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мае зямныя патрабаванні да ўрада ў тым, каб мы ўсё ж такі выканалі тое, што паставілі перад сабой у гэтым годзе», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Я разумею — складанасці і цяжкасці. Але лічыце, што ў нас ідзе ў эканоміцы вайна, ваенная становішча. І мы павінны зрабіць усё для таго, каб вось у гэтых ваенных эканамічных умовах выканаць тыя задачы, якія перад сабой паставілі, і мы павінны іх вырашыць у гэтым годзе», — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў далажыць, як вырашаецца гэта задача ва ўрадзе.

«Трэба абавязкова вырашыць тое, аб чым я гавару. Зямное, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Людзі ж не патрабуюць ад нас штосьці незвычайнае! Яны разумеюць, што мы працэнтаў на 80 трапілі ў гэты крызісны перыяд не па сваёй волі. Не мы таму віной».

«Але вылазіць з гэтага, напружваючыся да неймавернасці, давядзецца нам. Нікуды ад гэтага не дзенешся. Чакаць, што будуць лепшыя часы ў нашых суседзяў, на нашых рынках, не даводзіцца, вы бачыце, як развіваюцца падзеі. Таму давядзецца ісці, праломваючыся, канкурыруючы, на іншых рынкі. Гэта задача кожнага», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў бліжэйшым будучым будуць абмеркаваны стратэгічныя пытанні па развіцці краіны на наступную пяцігодку.

«Не хачу папракнуць цяперашні ўрад у гэтым, але ў нас склалася практыка: калі нешта не атрымліваецца, значыць, трэба Прэзідэнту або грамадству падсунуць нейкія вялікія крокі ў будучыню, і прытым крокі не заўтрашняга дня (я ўжо не гавару пра сённяшні), а нейкай аддаленай перспектывы. І калі я знаёмлюся з такімі канцэптуальнымі рэчамі для нашай краіны, я заўсёды думаю аб тым, хто ж будзе выконваць тое, што мы сёння вызначым», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Па-другое, людзям трэба жыць не толькі заўтра, гэта, зразумела, вельмі важна, але людзі жывуць сёння. І мы павінны забяспечыць усё неабходнае для таго, каб людзі жылі нармальна», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу на тое, што гэта не перадвыбарная рытарыка. «Мне ў гэтай рыторыцы, калі ўжо казаць шчыра, неабходнасці няма. І я на гэта не арыентуюся», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

# Нам ёсць чым ганарыцца

**Беларусы стварылі краіну, якой можна ганарыцца. Аб гэтым заявіла міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ падчас адзінага дня інфармавання ва ўнітарным прадпрыемстве «Ілаўскае» Мядзельскага раёна.**

Паводле слоў міністра, краіна, якую пабудавалі беларусы, мае сацыяльна арыентаваную эканоміку. У цэнтры ўвагі дзяржавы — яе грамадзяне з іх клопатамі і патрэбамі. «Як бы часам ні было складана, мы стварылі сваю краіну і развіваем яе, нам ёсць чым ганарыцца. Мы разам шмат чаго дасягнулі і даб'ёмся яшчэ большага, калі будзем плённа працаваць», — упэўнена Лілія Ананіч.

Міністр звярнула ўвагу, што палітыка дзяржавы заўсёды будзе нацэлена на тое, каб беларусы жылі ў дастатку, міры і спакоі, ганарыліся сваёй краінай. «Намі захапляюцца нашы госці, — адзначыла Лілія Станіславаўна. — Я не сустракала ніводнага чалавека, які не палічыў бы патрэбным шчыра сказаць, як тут добра».

**Надзея ПАЎЛАВА.**

■ Погляд

# АД САВЕЦКАГА МІНУЛАГА ДА СУЧАСНАСЦІ



**Нашу краіну час ад часу папракаюць тым, што яна мае моцную сувязь з савецкім мінулым, некаторыя нават называюць беларускую дзяржаву савецкай і камуністычнай пасярод мора ліберальнага капіталізму.**

## НОВЫ ТВАР САЦЫЯЛІЗМУ

Падаецца, што такое сцвярджэнне з'яўляецца як справядлівым, так і некарэктным адначасова. Сапраўды, афіцыйны Мінск не адмаўляе пераемнасці ад БССР, герб, сцяг і гімн якой у трохі мадэрнізаваным выглядзе сталі афіцыйнымі сімваламі сучаснай беларускай дзяржавы. Да таго ж, як і ў часы сацыялізму, дзяржаўная ідэалогія грунтуецца вакол тэмы Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а эканоміка захавала індустрыяльны лад, заснаваны на прамысловых флагманах савецкай эпохі.

Але ў той жа час, 20-гадовы шлях суверэннай Беларусі — гэта не толькі кансервацыя мінулага, але і ўласныя высокія дасягненні ў эканоміцы, культуры, палітыцы, што адкрываюць свету ўнікальны твар незалежнай беларускай дзяржавы. Напрыклад, згодна з міжнароднымі рэйтынгамі Мінск стаў увахадзіць у топ-лісты гарадоў свету, дзе жывуць найбольш кваліфікаваныя праграмісты, у Беларусі створаны і працуе адмысловы IT-кластар, прыбыткі якога ў апошнія гады большая за прыбыткі ад машынабудавання. Дзеля аб'ектыўнасці разгледзім іншы момант: як вяжацца з вобразам «камуністычнай Беларусі» той факт, што ў нашай краіне зарэгістравана больш за 800 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў, з якіх каля 300 тысяч вядуць актыўную дзейнасць? У такім выпадку больш правільным будзе параўноўваць Беларусь не з былым СССР, а з КНР, дзе да сацыялістычнай асновы былі дададзены элементы капіталістычнай эканомікі. Дарэчы, асобныя даследчыкі лічаць, што менавіта падобным да сучаснай беларускай мадэлі выглядаў бы Савецкі Саюз, калі б заўчасна не памёр, а паспяхова рэалізаваў свой план рэформаў генсек Юрый Андропаў.

**Відавочна, што, грунтуючыся на савецкай спадчыне, сучасная беларуская дзяржава імкнецца адпавядаць рэаліям XXI стагоддзя.**

Такой жа цікавай з пункту гледжання параўнання бачыцца і знешнепалітычная місія Беларусі ў свеце: наша краіна не мае місіянерскіх комплексаў і не займаецца экспартам ідэалогіі, пры гэтым, нягледзячы на некаторыя супярэчнасці з Захадам, Мінск не займаецца самаізаляцыяй і не ставарае праблем глабальнай бяспецы; наадварот, менавіта беларуская сталіца з'яўляецца ўнікальнай перамоўнай пляцоўкай, дзе міжнародныя эксперты шукаюць мірнае вырашэнне шэрагу лакальных канфліктаў.

Такім чынам, відавочна, што, грунтуючыся на савецкай спадчыне, сучасная беларуская дзяржава імкнецца адпавядаць рэаліям XXI стагоддзя. Здаецца, што беларусы, замест здзеку над уласнай гісторыяй, дэмантажу помнікаў і звяржэння былых герояў, выбралі іншы курс — шлях асэнсаванага аналізу і спалучэння каштоўнасцяў.

## ШЧЫРАЯ ПАЛІТЫКА

Узяўшы з савецкага часу лепшае, беларускае кіраўніцтва стараецца пазбавіцца ад горшага, бо менавіта тыя горшыя рысы сталі ўнутраным фактарам разбурэння СССР. Адной з найбольш прыкрых з'яў савецкай рэчаіснасці было замоўчванне праблемных пытанняў, спроба пазбавіць грамадства праўдзівай інфармацыі, абмежаваць удзел людзей у дзяржаўным жыцці. Фактычна такі падыход супярэчыў самой ідэі Саветаў, што была паднята на сцяг Кастрычніцкай рэвалюцыі, і прывёў да таго, што дыктатура пралетарыяту абярнулася ўзурпацыяй улады з боку партыйнай наменклатуры.

Відаць, што Беларусь улічвае тыя памылкі: у краіне створаны моцныя механізмы кантролю выканаўчай улады, што вымушае чыноўнікаў аператыўна рэагаваць на звароты грамадзян, не ўхіляцца ад вострых пытанняў і дыскусіі. Прыкладам у такім кірунку падае і сам Прэзідэнт. Скажам, у аўторак, 4 жніўня, адбылася гутарка кіраўніка Беларусі з прадстаўнікамі так званых «недзяржаўных» сродкаў масавай інфармацыі, і, на думку многіх аналітыкаў, гэтая сустрэча прайшла вельмі ўдала. Цікава, што напярэдадні шмат якія службовыя асобы спрабавалі пераканаць Аляксандра Лукашэнку ў немэтазгоднасці такой размовы, бо фактычна «недзяржаўнымі» ды «беларускімі» тыя СМІ з'яўляюцца толькі на словах: тая ж беларуская рэдакцыя радыё «Свабода» амаль на 100% фінансуецца з бюджэту ЗША.

Між тым зразумела, што, пагаджаючыся на інтэрв'ю для не самай лаяльнай аўдыторыі, Аляксандр Лукашэнка прадэманстраваў грамадству: у Беларусі няма закрытых тэм, улада не стане замоўчваць існуючыя праблемы і гатова да іх канструктыўнага абмеркавання. Адначасова Прэзідэнт даў зразумець, што дыскусія не ператорыцца ў чарговую «перабудову», а разбурыць дасягнутае за гады незалежнасці пад выглядам «рэформаў», чаго так чакаюць асобныя сілы паза межамі нашай краіны, не атрымаецца.

## СУВЕРЭННАЯ ДЗЯРЖАВА АДБЫЛАСЯ

Прэзідэнт удала адказаў на пытанні трох журналістаў, што тычыліся нацыянальнай бяспекі, эканомікі, ідэалогіі, знешняй палітыкі і культуры. Гэтае інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі пакінула вельмі шмат глебы для аналізу і разважанняў, а памеры аднаго газетнага артыкула наўрад ці дазволяць разгледзець кожную праблему паасобку. Адзінае, што трэба падкрэсліць асобна: Беларусь як краіна за апошнія 20 гадоў адназначна адбылася. Наша дзяржава мае ўласную палітычную традыцыю, знешнепалітычную місію, эканамічны лад і па факце, нягледзячы на некаторыя праблемы, з'яўляецца паспяховай еўрапейскай краінай.

Вяртаючыся да часоў СССР, неабходна ўспомніць, што ўсе 15 былых савецкіх рэспублік фактычна стартавалі з аднолькавых пазіцый. У некага стартавыя магчымасці, вядома, былі большыя (за кошт рэсурсаў, як у Азербайджана, ці за кошт канцэнтрацыі прамысловасці, як ва Украіне), у некага меншыя, аднак у вольнае плаванне маладыя суверэнныя чаўны выйшлі адначасова. Па выніках гэтага плавання толькі Беларусь ды краіны Балтыі былі пазбаўлены ліха грамадзянскай вайны, рэвалюцый, канфліктаў з суседзямі.

**Наша краіна не мае місіянерскіх комплексаў і не займаецца экспартам ідэалогій.**

Крытыкі з ліберальнага лагера прадказальна папракнуць, маўляў, зноў наперад выстаўляецца нібыта «заезджаная» каштоўнасць «стабільнасці», але няхай тыя крытыкі раскажуць пра недахопы стабільнага жыцця 140 тысячам бежанцаў з Украіны, што знайшлі прытулак і працу на беларускай зямлі! Безумоўна, стабільнасць, закон і парадак — гэта найпершыя ўмовы для развіцця эканомікі і паляпшэння дабрабыту грамадзян. Але пра эканоміку і дабрабыт мы пагаворым наступным разам...

**Аляксандр ШПАКОЎСКІ**

■

■ Парламенцкі дзённік

# УСЁ ДОБРА, АЛЕ МОЖНА І ЛЕПШ

**Пашыраць кааперацыйныя сувязі і ствараць новыя вытворчасці. Менавіта такі шлях развіцця для ААТ «Інвет» убачыў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка падчас яго наведвання.**

Раней прадпрыемства выпрабляла прадукцыю зоаветэрынарнага прызначэння для ўсяго СССР. Але з распадам Савецкага Саюза рынкі збыту былі страчаны, прадпрыемства апынулася на мяжы ліквідацыі. У 2006 годзе Віцебскім абласным выканкамам сумесна з урадам быў зроблены шэраг захадаў — і вытворчасць удалося захаваць. «Прынялі рашэнне, што гэтае прадпрыемства будзе працаваць у кааперацыі з Міністэрствам прамысловасці, у прыватнасці з Мінскім трактарным заводам і вытворчым аб'яднаннем «Гомсельмаш», — сказаў спікер ніжняй палаты. Дзякуючы гэтаму сёння на ААТ «Інвет» наладжаны выпуск паліўных бакаў, укладзены значныя інвестыцыі, захаваны працоўныя месцы.

Як бы добра ні склаўся лёс прадпрыемства, пакуль яно таксама не ідэальнае. «Галоўная мэта цяпер — гэта пашырэнне кааперацыйных сувязяў з тым жа трактарным заводам, і такія магчымасці ёсць. Тут прысутнічае кіраўніцтва завода, канструктары, і мы шукаем падыходы, каб пашырыць узаемадзеянне на карысць і заводу, і Мінпраму, і Беларусі», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка. Па яго словах, адным з асноўных пытанняў застаецца нарошчванне экспарту. «У прадпрыемства вялікі імпартны складнік — электраэнергія, поліэтылен, тэрмапластмасаўтаматы. Неабходна дыверсіфікаваць рынкі — знаходзіць новыя і пашыраць прысутнасць у Расіі, Казахстане», — лічыць спікер і дадае, што пры гэтым нельга забываць пра неабходнасць зніжаць выдаткі прадпрыемства.

Праўда, адным наведваннем ААТ «Інвет» візіт старшыні Палаты прадстаўнікоў не абмежаваўся. Уладзімір Андрэйчанка высока ацаніў дасягненні аграрыяў Верхнядзвінскага раёна: «Я задаволены тым, што ўбачыў на палях. Жніво тут пачалі крыху са спазненнем, але дзякуючы таму, што выконваюцца тэхналогіі, людзі творча ставяцца да даверанага ўчастка працы, асабліва аграномічная служба, у раёне вырашчаны нядрэнны ўраджай. Думаю, што ёсць усе магчымасці забяспечыць валавы збор на ўзроўні мінулага года. Зараз у Верхнядзвінскім раёне ўраджайнасць больш за 40 ц/га — гэта выдатны паказчык».

Але пры добрай ураджайнасці для гэтага раёна дагэтуль актуальнай праблемай застаецца забяспечанасць палівам. «Усюды запас паліва не большы, чым на двое сутак. У такіх умовах працаваць даволі праблематычна. Гэтае пытанне мы абмяркоўвалі з губернатарам, у яго адбылася размова з віцэ-прэм'ерам, ідзе пошук падыходаў», — упэўніў спікер ніжняй палаты беларускага парламента.

**Станіслава ПРУШЫНСКАЯ.**

■ Выбары–2015

## Працэдура дэкларацыі даходаў спрошчана

**Сёлетнім кандыдатам у прэзідэнты будзе прасцей дэкларыраваць свае даходы. Гэта стала вядома па выніках пасяджэння Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.**

— Дзейнічаў стары дакумент, ён змяніўся дзякуючы нашым разам з Міністэрствам па падатках і зборах намаганням і стаў больш простым, — паведаміла журналістам **старшыня ЦВК Лідзія ЯРМОШЫНА.** — Прасцей запаўняць тыя звесткі, якія раней з'яўляліся для кандыдата спрэчнымі. Асабліва калі, напрыклад, ён не зарплату атрымлівае, а з'яўляецца прыватным прадпрымальнікам. Адразу ўзнікала пытанне: а якую суму ён павінен указваць?

Старшыня Цэнтральнай камісіі звярнула ўвагу на тое, што кандыдат, калі ён не мае крыніцы даходаў, абавязкова павінен пазначыць, за кошт якіх сродкаў ён жыве.

— Гэта тычыцца толькі кандыдата, — падкрэсліла Лідзія Ярмошына. — На жонку і блізкіх сваякоў абавязак паведаміць падобныя звесткі не распаўсюджваецца.

Па яе словах, цяпер у Цэнтральнай камісіі ёсць магчымасць вызначыць, якія парушэнні пры запаўненні дэкларацыі з'яўляюцца неістотнымі.

— Калі кандыдат памыліўся на суму, якая складае менш за 20% яго гадавога дахода, то гэта неістотная памылка і яна не можа з'яўляцца падставай для адмовы ў рэгістрацыі кандыдатам у Прэзідэнты, — адзначыла старшыня ЦВК.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## Адпачынак на любы густ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Віктар Якжык зазначыў, што ў апошнія гады намецілася станоўчая тэндэнцыя ў арганізацыі аздараўлення школьнікаў як у асобных рэгіёнах, так і ў цэлым па краіне. Гэтым летам у Беларусі дзейнічаюць 174 стацыянарныя летнікі. Іх колькасць у параўнанні з папярэднімі гадамі не зменшылася. Лагеры з круглагадовым знаходжаннем працуюць у чатырохзменным рэжыме з працягласцю кожнага заезду ад 18 да 21 дня. Колькасць дзяцей, што аздараўляюцца, вагаецца ў краіне апошнія пяць гадоў ад 32 да 36%.

Цэнтральным мерапрыемствам рэспубліканскай акцыі «Лета на карысць» стане фестываль летніх аздараўленчых лагераў, які адбудзецца ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» з 16 па 18 жніўня.

Дарэчы, у гэтым сезоне дзіцячы цэнтр запрасіў беларускіх дзяцей адпачыць у Балгарыю. Лагер «Зубраня» размясціўся на арандаванай базе на тэрыторыі паміж Варнай і буйным курортам Залатыя Пяскі, куды ён перанёс усе свае традыцыі. Праграма ў летніку даволі насычаная: купанне ў моры і басейне з мінеральнай вадой, пляжныя гульні і забавы, прагулкі і экскурсіі, творчыя конкурсы, спартыўныя спаборніцтвы і аб'яднанні па інтарэсах, анімацыйныя праграмы і праекты. Працуюць з дзецьмі кваліфікаваныя педагогі з НДЦ «Зубраня» і анімацыйная каманда «Альбатрос» з Балгарыі.

— Ва ўсіх выхаваўча-аздараўленчых установах сёлета ў поўнай меры задзейнічаны патэнцыял педагогаў-прадметнікаў. І, што асабліва радуе, значна вырасла колькасць педагогаў, якія пайшлі працаваць у аздараўленчыя лагеры па закліку душы, — падкрэсліў намеснік міністра адукацыі. — Гэта першае лета, калі мы не прымалі нейкіх спецыяльных (перш за ўсё, у рэгіёнах) захадаў, каб набраць людзей для працы ў аздараўленчых летніках.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Жніво

### ДЗВЕ ВОБЛАСЦІ ЎЖО НАМАЛАЦІЛІ ПА МІЛЬЁНЕ ТОН ЗБОЖЖА!

Гэта Брэстчына, дзе агульны намалот склаў 1 млн 35 тыс. тон, і Міншчына, дзе намалот склаў 1 млн 5 тыс. тон збожжа. Цяпер у Беларусі намалочана 4436,6 тыс. тон збожжа пры ўраджайнасці 36,4 ц/га. Ужо ўбрана 54,2% пасяўных плошчаў. Як адзначылі спецыялісты Мінсельгасхарча, многае залежыць ад умоў надвор'я, а зараз яно добра спрыяе збору ўраджаю. Усе астатнія меры па падрыхтоўцы ўжо прынятыя. Жніво плануецца завяршыць цягам 10-12 дзён.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

# СУПРАЦОЎНІЦТВА БЫЛО ПЛЁННЫМ

**Пасол В'етнама ў нашай краіне До Ван Май перад завяршэннем сваёй дыпламатычнай місіі сустрэўся са старшынёй Палаты прадстаўнікоў Уладзімірам Андрэйчанкам, каб падвесці вынікі сваёй працы ў Беларусі.**

— Вы вельмі шмат зрабілі для развіцця стасункаў паміж Рэспублікай Беларусь і Сацыялістычнай Рэспублікай В'етнам, — заўважыў спікер ніжняй палаты. — Натуральна, гэта ўсё станоўча адбілася на развіцці эканомікі В'етнама і Рэспублікі Беларусь.

Уладзімір Андрэйчанка звярнуў увагу на высокі ўзровень міжпарламенцкага супрацоўніцтва паміж краінамі.

— У нас добра наладжана міжпарламенцкае ўзаемадзеянне. Летась адбыўся візіт у В'етнам нашага кіраўніка групы дружбы Віталя Бусько. Мы вельмі плённа супрацоўнічалі ў міжпарламенцкіх міжнародных арганізацыях.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў таксама ролю в'етнамскага пасла ў павелічэнні аб'ёмаў беларускага экспарту ў гэтую краіну:

— Дзякуючы вам мы нарасцілі пастаўкі новай прадукцыі ў В'етнам. Зараз вельмі добрыя перспектывы ў нас адкрываюцца ў сувязі са стварэннем Еўразійскага эканамічнага саюза. 29 мая гэтага года было падпісана пагадненне паміж ЕАЭС і В'етнамам аб стварэнні зоны свабоднага гандлю.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Май на ўвазе

### З ІСТОТНЫМІ ЗНІЖКАМІ...

**8 і 9 жніўня ў Мінску пройдзе маштабны агульнагарадскі кірмаш «стокавай» прадукцыі.**

На гандлёвай пляцоўцы побач з Палацам спорту (праспект Пераможцаў, 4) будуць прадстаўлены вырабы каля 30 буйных айчынных прадпрыемстваў — вытворцаў тэкстыльных, швейных, трыкатажных, галантарэйных тавараў і абутку: Аршанскі льнокамбінат, «Магатэкс», «Сукно», «БВБА», «Ромгіль-Тэкс», «Бабруйсктрыкатаж», «Купалінка», «Белфа», «Алеся», «Світанак» і іншыя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# «АД СТАРОГА МОСТА АМАЛЬ НІЧОГА НЕ ЗАСТАНЕЦЦА»

## Рэканструкцыя адной з галоўных транспартных артэрый цераз Днепр ідзе поўным ходам

**Пушкінскі мост у Магілёве — адзін з самых галоўных, ён злучае цэнтр горада з Кастрычніцкім раёнам. З моманту свайго адкрыцця ў 1959 годзе ён яшчэ ні разу не закрываўся на капітальны рамонт. Сёлета мост гучна нагадаў пра сябе абрушэннем некалькіх пралётаў агароджы. На шчасце, абышлося без пацярпелых. Пасля гэтага ён быў часткова перакрыты для пешаходаў, а на ўездзе з'явіліся папярэджальныя знакі аб абмежаванні транспартнага руху.**



Між тым лёс моста быў вырашаны яшчэ летась. Аб крытычным стане аб'екта мясцовыя ўлады паведамілі Прэзідэнту падчас яго наведвання Магілёўскай вобласці ў лістападзе. Кіраўнік дзяржавы даў даручэнні разгледзець магчымасць уключэння моста ў планы на мадэрнізацыю. Пратакол з указаннем тэрмінаў быў падпісаны 22 снежня. Дакументам прадугледжана ўключэнне аб'екта ў інвестыцыйную праграму на 2016 год на ўмовах роўнадолевага фінансавання за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў (20%) і крэдытных рэсурсаў банка (80%). Гэтым жа пратаколам кіраўнік дзяржавы даручыў Магілёўскаму аблвыканкаму ў другой палове 2015 года прыступіць да капітальнага рамонту моста. І рэканструкцыя пачалася ў акрэсленыя тэрміны.

Улічваючы запатрабаванасць моста, яго вырашана было цалкам не закрываць. Наогул мясцовыя ўлады паклапаціліся, каб часовыя нязручнасці як мага менш адбіліся на гараджанах. Тралейбусныя лініі прыйшлося дэмантаваць, але распрацавана новая схема руху грамадскага транспарту, дзе задзейнічана больш аўтобусаў і маршрутак.

Падрыхтоўчыя работы ўжо завершаны, будаўнікі ўступілі ў асноўную стадыю капітальнага рамонту. Адна з палоў моста цалкам перакрытая, разбіраюцца старыя бэлькі і вядзецца мантаж новых пралётных пабудоў. Галоўны падрадчык — ААТ «Мостабудстрой», але аб'ект можна лічыць агульнай рэспубліканскай будоўляй. Тут працуюць спецыялісты з усёй краіны. Складанасці хапае, работы часткова вядуцца нават пад вадой. Для ўмацавання апорнай часткі моста будаўнікам давялося паглыбіцца ў рэчышча Дняпра на некалькі дзясяткаў метраў.

Да канца снежня будаўнікі плануюць цалкам завяршыць рамонт гэтай часткі моста. «Праблем з фінансаваннем няма, — запэўніў **намеснік дырэктара ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Магілёўскага гарвыканкама Андрэй САСІН.** — Збіраемся засвоіць каля 70 мільярдаў рублёў дарожнага фонду і крэдытных сродкаў Банка развіцця».

У наступным годзе плануецца цалкам зрабіць мост. Па словах Андрэя Сасіна гэта будзе зусім новая пабудова, ад былога ў ім амаль нічога не застанецца. Пасля рэканструкцыі мост атрымае 2 дадатковыя паласы руху і стане шырэйшым амаль на 10 метраў. Яго прапускная здольнасць павысіцца прыблізна на 30%. Але работы на гэтым не скончацца. Праектам прадугледжана таксама пашырэнне Дняпроўскага спуску ад плошчы Арджанікідзе да вуліцы Чалюскінцаў і Пушкінскага праспекту да перасячэння з вуліцай Гагарына. Акрамя гэтага, запланавана будаўніцтва транспартнага вузла і падземнага пераходу каля плошчы Славы з выхадам на мост і вуліцу Вялікую Грамадзянскую — да парку культуры і адпачынку ў Падніколлі.

На рэалізацыю праекта «Рэканструкцыя транспартнага вузла на скрыжаванні вуліцы Чалюскінцаў і праспекта Пушкінскага ў горадзе Магілёве» пойдзе каля 300 мільярдаў рублёў. Нарматыўны тэрмін будаўніцтва, згодна з распрацаваным праектам, складае 22 месяцы. Іншымі словамі, да канца 2017 года аб'ект павінен быць здадзены цалкам.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Шпацыр па Камароўцы

## БУЯКІ І АЖЫНАКЛУБНІЦЫ

### На рынку — пік свежых ягад

**Сезоннымі фаварытамі жніўня па праве лічацца салодкія прадстаўнікі бахчавых культур — дыні і кавуны. І сапраўды, у першую чаргу на Камароўцы кідаюцца ў вочы прылаўкі, на якіх красуюцца менавіта яны. За кілаграм салодкага «паласаціка» ў сярэднім просяць 7-8 тысяч рублёў. Яго жоўтая мядовая суседка па бахчы ідзе нашмат даражэй — кілаграм «тарпеды» і «калгасніцы» аддаюць за 15 тысяч рублёў, хоць можна адшукаць дыні і па 10-12 тысяч за кілаграм. Аднак пакуль што асаблівага ажыятажу вакол бахчавых няма.**



Іншая справа — чарэшні і вішні. Час гэтых ягад амаль адышоў, таму людзі спяшаюцца іх набыць на кампоты, варэнне ці проста падсілкавацца жывымі вітамінамі. Нельга адвесці вачэй ад буйной, ледзь не чорнай, узбекскай чарэшні (35 тысяч рублёў за кілаграм). Беларускія вішні каштуюць танней, ад 17 тысяч за кілаграм і вышэй. Айчынныя слівы, ад якіх таксама ломяцца прылаўкі, лёгка знайсці па тым жа кошце. Паўлітровы слоік ажын аблегчыць ваш кашалёк на 25 тысяч рублёў, а слоік агрэсту выйдзе таннейшым на 5 тысяч рублёў. Чарніцы ў сярэднім «важаць» 35 тысяч за кілаграм. Буякі ёсць і па 45, і па 70 тысяч за кілаграм. Гаваркая прадавачка раіць не ўпускаць момант і браць сінія з шызым налётам ягады, пакуль яны «ў самым соку».

— Яшчэ тыдзень набывайце смела, пасля ягады пойдуць драбнейшыя, з кіслінкаю, больш падобныя да чарніц. Але ўбачыце, «заломяць» па 90 тысяч рублёў за кілаграм такіх буякоў, — папярэджвае дзяўчына.

На суседнім прылаўку забавляюць незвычайным ласункам — ажынаклубніцамі. Ягады, падобныя да буйных чырвоных суніц альбо калючых на выгляд клубніц, каштуюць нямала: паўлітровы слоік гібрыдаў абыдзецца ў 50 тысяч рублёў. Спакуслівa, аднак на тую ж суму можна набыць кілаграм вялізных мядовых абрыкосаў альбо грэчаскіх груш ці 2-3 плады авакада.

Несумненнай папулярнасцю карыстаюцца таксама персікі з Грэцыі: у залежнасці ад памеру і стану забраць салодкія плады прапануюць як за 14, так і за 28 тысяч рублёў за кілаграм. Іспанскія нектарыны ў асноўным трымаюць планку ў 14-15 тысяч рублёў за кілаграм. Сярод яблыкаў найбольш папулярны сорт «белы наліў». Кошты адпавядаюць памерам пладоў — 10, 18, 23 тысячы за кілаграм. За духмяныя грушы просяць па 20 тысяч за кілаграм. Калі хочацца заморскай садавіны, то выбраць ёсць з чаго. Бананы лепш купляць уважліва, каб не пераплаціць: у сярэднім іх прадаюць па 12 і вышэй тысяч за кілаграм. Апельсіны трымаюць цэннік «30». За такі кошт можна набыць і кілаграм лімонаў, хоць ёсць цытрусавыя і па 65 тысяч рублёў. Кіло ананасаў выйдзе на 15 тысяч рублёў даражэй.

Свежыя агуркі для лёгкай салаты знойдуцца па кошце ў 10-12 тысяч за кілаграм, за гэтыя грошы вам прададуць і кіло пінскіх памідораў. Таматы «чорны прынц» у сярэднім каштуюць 35 тысяч рублёў за кілаграм. Маладая бульбачка ёсць у наяўнасці па розных цэнах — ад 6 да 11 тысяч рублёў за кілаграм. Карыстаюцца попытам баклажаны, кілаграм якіх каштуе не больш за 15 тысяч рублёў. Затое аматарам грыбоў давядзецца раскашэліцца. Лісічкі — толькі з лесу — аддаюць па 20 і 40 тысяч адпаведна за паўлітровы і літровы слоікі. Шампіньёны з Баранавіч прадаюць па 25 тысяч за кілаграм, у два разы даражэй выйдзе паўлітра падасінавікаў. За літровае вядзерца баравікоў прадаюць хочуць атрымаць 180 тысяч рублёў.

**ЛІЧЫЛЬНІК «ЗВЯЗДЫ» (кошт за кілаграм, калі не пазначана іншае)**

Сала салёнае — 130 тыс.
Шпік «Апетытны» — 130 тыс.
Цяляціна (лапатка без косткі) — 90 тыс.
Мяса на шашлык (ялавічына) — 100 — 120 тыс.
Кураня бройлернае — 31 тыс.
Селядзец слабасалёны — 45 тыс.
Каўбаса сыравэнджаная — 180 тыс.
Палянднвіца — 183-200 тыс.
Зельц — 80 тыс.
Рыс «Жасмін» (700 г) — 17 тыс.
Крупа грэчневая (900 г) — 15 тыс.
Алей сланечнікавы рафінаваны (900 мл) — 21 тыс.
Яйка курынае Д-В (дзясятак) — 16,5 тыс.
Буракі — 12 тыс.
Морква — 10-16 тыс.
Капуста — 4,5 — 7 тыс.
Шчаўе (пучок) — 7-10 тыс.
Цыбуля зялёная (пучок) — 5-7 тыс.
Часнок (1 шт.) — 5 тыс.
Базілік (пучок) — 8-15 тыс.
Мята (пучок) — 10 тыс.

**Кацярына РАДЗЮК.** *radziuk@zviazda.by*

# АЎТОГРАФ АД ЧАРАЎНІЦЫ

### У рамках акцыі «Лета з добрай кнігай» прайшоў штогадовы кніжны марафон

**Падчас яго беларускія пісьменнікі, літаратуразнаўцы, укладальнікі, аўтары і выканаўцы песень зладзілі сустрэчы са сваімі чытачамі ў сталічнай кнігарні «Светач».**

Першай пра сябе расказала дзіцячая пісьменніца Кацярына Хадасевіч-Лісавая, аўтарка кніг «Казкі сіняй падушкі», «Казкі сівой даўніны», «Код геніяльнасці» і інш. Яна ўпэўнена, што для дзетак трэба пісаць на беларускай мове, каб яны змалку шанавалі роднае слова. Казачніца распавяла сваім маленькім чытачам і іх бацькам, што, каб пісаць чароўныя гісторыі, яна сама стала крыху чараўніцай — феяй Краіны сноў. У доказ гэтага пісьменніца стала загадваць прысутным загадкі, а за правільныя адказы чаравала для іх добрыя сны.

Аб трагічных падзеях вайны расказала лаўрэат літаратурнай прэміі імя Янкі Маўра Ніна Галіноўская. Аўтарка кнігі «Калі я шчаслівы» прачытала некалькі сваіх вершаў, у тым ліку кранальны твор «Размова з бацькам», які прысвяціла свайму тату, што загінуў у вайну.

Сваімі творамі чытачоў і слухачоў радавалі таксама Міхась Пазнякоў, Віктар Шніп, Дзмітрый Пятровіч, Зося Кустава, Анатоль Верабей, Алесь Камоцкі, Таццяна Сівец, Алег Ждан, Віктар Ляскоўскі.



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.



Наведвальнікі кнігарні змаглі паўдзельнічаць у літаратурнай вікторыне, атрымаць памятныя падарункі, паслухаць выступленне сямейнаэстраднага ансамбля Алены Царашковай «Без секунднай стрэлкі». Набыць кніжкі і іншыя тавары ў кнігарні можна было з 10-працэнтнай зніжкай, ды яшчэ і ўзяць аўтограф у аўтара, што многія і паспяшаліся зрабіць. Дарэчы, кнігарня была адчынена да 23.00.

Арганізатарамі акцыі выступілі ААТ «Белкніга», выдавецтва «Мастацкая літаратура» і Выдавецкі дом «Звязда».

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*

# АСВЯЦІЛІ САМЫ ВЯЛІКІ Ў КРАІНЕ ХРАМ

### Гэта адбылося ў дзень памяці свяціцеля Георгія Каніскага



Фота БЕЛТА.

Георгій Каніскі, дзень памяці якога штогод адзначаюць у Магілёве, шмат зрабіў для горада. Выдатны філосаф, педагог і грамадскі дзеяч Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі 20 жніўня 1755 года быў прызначаны епіскапам (пазней — архіепіскапам) Магілёўскім. Змагаўся за роўнасць праваў падданых Рэчы Паспалітай, якія належалі да розных канфесій. Клапаціўся пра асвету духавенства, павышаў адукацыйны ўзровень паствы. У 1757 годзе ён адкрыў у Магілёве духоўную семінарыю і арганізаваў друкарню пры архіепіскапскім доме. У 1993 годзе Георгій Каніскі быў далучаны да ліку мясцовашанаваных святых Беларускай Праваслаўнай Царквы.

Сімвалічна, што менавіта ў дзень памяці свяціцеля ў Магілёве адчыніў свае дзверы кафедральны Свята-Праабражэнскі сабор, самы вялікі ў Беларусі — яго вышыня складае 60 метраў. У XVIII стагоддзі ў горадзе існаваў храм з такой назвай, але ў 1938 годзе ён быў разбураны. Новы ўражвае сваёй прыгажосцю і веліччу. Будаўніцтва храма вялося з 2001 года, у 2008 годзе былі асвечаны храмавыя купалы і крыжы. Адкрыццё праваслаўнай святыні ў Магілёве чакалі з нецярпеннем, на ўрачыстае набажэнства прыехалі нават паломнікі з іншых гарадоў. Чын вялікага асвячэння і Боскую Літургію ўзначаліў мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Удзел у богаслужэнні прымалі архірэі Беларускай Праваслаўнай Царквы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Здарэнні

## ТРАЛЕЙБУС НАЛЯЦЕЎ НА МАЧТУ

**Вечарам на сталічнай вуліцы Кальварыйскай насупраць праектнага інстытута «Белжылпраект» у мачту асвятлення ўрэзаўся тралейбус.**

У службу выратавання пазванілі відавочцы здарэння. На месца былі накіраваныя два аўтамабілі і восем чалавек асабовага складу. Высветлілася, што са слупом сутыкнуўся тралейбус маршруту №9 «ДС «Гарадскі вал» — ДС «Кунцаўшчына» тралейбуснага парка №4. З кабіны жанчыну-вадзіцеля давялося даставаць пры дапамозе спецінструмента. Пацярпелую шпіталізавалі ў гарадскую клінічную бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Бывае ж...

## ВЫРАШЫЎ АДДАЦЬ ЧУЖОЕ

**Падазраваны ў крадзяжы вырашыў вярнуць прысвоены ноўтбук, калі ягоны фотаздымак з'явіўся ў сродках масавай інфармацыі.**

Арыенціроўкі патэнцыйнага злодзея апублікавалі пасля таго, як да праваахоўнікаў звярнулася 30-гадовая жыхарка сталіцы. Падчас наведвання гіпермаркета яна пакінула ноўтбук у камеры захоўвання, а калі вярнулася — камп'ютара ўжо не было. Паводле відэазапісаў мужчына, які знёс чужы лэптоп, акрамя сваёй ячэйкі, спрабаваў адчыніць яшчэ некалькі, у адной з іх ён і знайшоў ноўтбук. А калі пасля даведаўся, што яго шукаюць, усё ж такі вырашыў вярнуць чужое. Ён дамовіўся сустрэцца з гаспадыняй камп'ютара, але яна прыйшла не адна, а разам з міліцыянерамі.

— За падобны крадзеж затрыманаму пагражаюць грамадскія работы альбо штраф, папраўчыя работы тэрмінам да двух гадоў або арышт да шасці месяцаў, — кажа **Вераніка СТРЭЛЬСКАЯ, прэс-афіцэр Фрунзенскага РУУС сталіцы**.

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*




■ Азбука бяспекі

# У СПЁКУ ЛЕПШ ЗА РУЛЬ НЕ САДЗІЦЦА

**У сувязі з гарачым надвор'ем, якое чакаецца ў краіне на выхадныя, Дзяржаўтаінспекцыя заклікае кіроўцаў пры планаванні паездак на аўтамабілі, у тым ліку і за горад, паклапаціцца пра ўласную бяспеку.**

У першую чаргу пры такім надвор'і па магчымасці лепш увогуле адмовіцца ад кіравання транспартным сродкам, бо высокая тэмпература паветра з'яўляецца павышаным фактарам рызыкі для ўсіх удзельнікаў дарожнага руху. У людзей можа з'явіцца млявасць, санлівасць, галавакружэнне, зніжэнне канцэнтрацыі ўвагі, хуткасці рэакцыі на розныя дарожныя сітуацыі, што ў першую чаргу павялічвае небяспеку ўзнікнення дарожна-транспартных здарэнняў. Калі ж паездку нельга адкласці, лепш планаваць яе на ранішні ці вячэрні часы. Пры гэтым неабходна памятаць элементарныя правілы бяспекі.

Перад пачаткам руху абавязкова праверце тэхнічны стан транспартнага сродку (асаблівая ўвага — сістэме ахаладжэння рухавіка), праветрыце салон. Прасачыце за тым, каб у вас з сабой у дарозе была вада. Калі падчас руху адчуеце недамаганне, трэба адразу спыніцца, выпіць вады, умыцца, пры неабходнасці прыняць лекі. Калі стан не палепшыцца, лепш адмовіцца ад кіравання транспартным сродкам. Ні пры якіх абставінах не пакідайце ў салоне аўтамабіля без нагляду дзяцей і сваіх хатніх гадаванцаў, нават на кароткі час.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by.*

Глеб ЛАЎРОЎ:

# «ПАМЯЦЬ НЕ БЫВАЕ ТОЛЬКІ «ЧОРНАЙ» ЦІ «БЕЛАЙ»

**Напярэдадні новага тэлевізійнага сезона 2015-2016 творчая каманда Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі прапаноўвае гледачам тэлеканалаў «Беларусь 1» і «Беларусь 24» цыкл хранікальна-дакументальных фільмаў, які расказвае пра тое, як змянілася наша краіна за два дзесяцігоддзі суверэннай гісторыі. Праект пад назвай «Беларусь XXI» — гэта спроба ўзгадаць, з якіх пазіцый дзяржава стартавала і чаго дасягнула за часы сваёй незалежнасці. Пра адметнасць дакументальнага цыкла і тое, чым ён будзе карысны кожнаму, мы пагаварылі з яго ўдзельнікам, палітычным аглядальнікам АТН Глебам ЛАЎРОВЫМ.**



***— У мінулую нядзелю стартаваў праект «Беларусь XXI», гледачы ўбачылі першы выпуск шматсерыйнага фільма. Раскажыце, якая праца папярэднічала яго з'яўленню і што робіцца цяпер?***

— Я падключыўся да працы не з самага пачатку, але ведаю, што сама ідэя, якая належыць кіраўніку АТН Івану Эйсманту, узнікла і была заяўлена яшчэ года паўтара таму. А зараз напярэдадні новага тэлевізійнага сезона вырашылі даць новае жыццё гэтай ідэі. І цяпер над праектам працуе вялікая каманда прафесіяналаў, задзейнічаны найлепшыя сілы Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі на ўсіх этапах вытворчасці. Дакументальны цыкл складаецца з дзесяці серый, якія ахопліваюць больш за 20 гадоў гісторыі нашай краіны. У ім выкарыстана вялікая колькасць рознага кшталту архіўных матэрыялаў, асабліва ў першых выпусках. Праца складаная, бо, напрыклад, адзінага відэаархіва ў сярэдзіне 1990-х не існавала. Звярталіся мы таксама ў Нацыянальны архіў, у Нацыянальную бібліятэку, аналізавалі прэсу таго ці іншага перыяду... І зараз творчы працэс працягваецца, прычым не толькі ў сценах кабінетаў, але і па-за іх межамі: камадзіроўкі, інтэрв'ю з героямі... Але трэба разумець, што, акрамя архіўных даследаванняў, калі мы маем справу з тэлебачаннем, праца вядзецца і «з колаў», нешта перакройваецца і перапісваецца ледзь не ў апошні момант.

***— Над чым канкрэтна працуеце вы як аўтар?***

— Я пакуль што займаюся перыядам 1997-1999 гадоў. Аднак, варта разумець, што ў нашай каманды агульнае бачанне праекта. Пачынаючы з яго прадзюсара — гэта намеснік старшыні Марат Маркаў — і заканчваючы кожным журналістам, які працуе над «Беларусь XXI». Тон задаў Юрый Пракопаў, аўтар першай серыі, таму стыль будзем падладжваць пад ужо зробленыя фільмы. Я, напрыклад, спецыялізуюся на знешняй палітыцы. А так атрымалася, што на 1997-1999 гады прыпаў такі цікавы эпізод, як з'яўленне ў нашай краіне мабільнай сувязі. Паколькі сам ёю не карыстаюся, бо мне падабаецца размаўляць з людзьмі асабіста, то не сутыкаўся з эвалюцыяй мабільнай сувязі ў Беларусі. І быў здзіўлены, займаючыся распрацоўкай тэмы, што, аказваецца, усе ведаюць пра гэта. Пры падрыхтоўцы сваёй серыі я больш арыентуюся на падзеі, з якімі ў мяне асацыяваўся гэты перыяд. Напрыклад, тыя гады мне больш запомніліся трагедыяй у Югаславіі, дзе Беларусь і на гуманітарным узроўні, і на ўзроўні найвышэйшага палітычнага кіраўніцтва дапамагала гэтай краіне пераадольваць праблемы... Добра, што ёсць каманда, якая падключаецца, глядзіць на зробленае, нешта карэктуе, падкідвае свежыя ідэі. Над падрыхтоўкай кожнай серыі працуе нехта новы пад агульным кіраўніцтвам і з дапамогай вялікай колькасці людзей. Вось, напрыклад, у першай серыі ў нас быў задзейнічаны старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька. Ён выступаў як непасрэдны сведка падзей таго часу. І калі чалавек можа рэтраспектыўна паглядзець на нейкі працэс, то гэта выклікае цікавасць у гледача. Вяртаючыся да падзей, пра якія рыхтую агляд, я магу сказаць, не разбураючы інтрыгі, што быў уражаны інтэрв'ю з адным спартсменам, чый трыумф прыпаў на тыя гады. Я ехаў да вядомага чалавека, які пакінуў свой след у гісторыі, а ён пры ўсіх сваіх заслугах аказаўся вельмі адкрытым суразмоўцам, які бачыў нашу гісторыю зусім па-іншаму. Тут, мне падаецца, і хаваецца ключавая асаблівасць усяго нашага цыкла, дзе гісторыя адна для ўсіх. Але, зазіраючы ў мінулае з пазіцыі дня сённяшняга, можна не толькі ўзгадваць, але і фарміраваць нейкі погляд на будучыню. Наш фільм дазваляе не толькі здзівіцца: маўляў, трэба ж, а я і забыўся! Але і паразважаць пра рэчаіснасць.

***— З пазіцыі гледача скажу, што падчас прагляду не абыходзіцца без пачуцця настальгіі...***

— Я не бачу ў гэтым нічога дрэннага. Чалавек, не ведаючы свайго мінулага, не зможа пабудаваць будучыню. Калі ты маеш нешта блізкае, што кранае, выклікае эмоцыі, то не можаш гэтага не любіць. Нават, напрыклад, у адносінах дваіх людзей: калі добра ведаеш чалавека, то не можаш быць да яго абыякавым. А хацець перамен, імкнуцца паляпшаць тое, што любіш, — гэта натуральнае жаданне. І настальгія застаецца ў чалавека нават па самых цяжкіх перыядах. Бо былі ж там і пазітыўныя, станоўчыя моманты ў кожнага з нас. Проста, пераглядаючы старыя фатаграфіі, ты ўспамінаеш: ды вось гэта было тады, а там жа яшчэ адбылося тое і тое... Звяртацца да мінулага без настальгіі немагчыма. Вось успомніце грошы тых часоў — «зайчыкі».

**Дакументальны цыкл складаецца з дзесяці серый, якія ахопліваюць больш за 20 гадоў гісторыі нашай краіны.**

Тут жа прыгадаецца мноства гісторый... Мама прыносіць дадому заробак у «зайчыках», потым сыходзіць з часткай грошай у краму. А калі вяртаецца, то бачыць, як дзіця зрабіла з «вавёркі», «зайчыка», «ваўка» аплікацыю. Так зарплата станавілася «творам мастацтва»... Цяпер гэта ўспамінаецца з усмешкай. Памяць, як і гісторыя, не бывае толькі «чорнай» або «белай». Але, аналізуючы негатыўны і пазітыўны вопыт, мы бачым, што маем на выхадзе. І дзякуючы гэтаму можна зразумець, як дзейнічаць далей, каб не атрымалася злому, канфрантацый у грамадстве.

***— Улічваючы, як неспакойна сёння навокал, гэта вельмі актуальна...***

— Тут яшчэ такі момант: на фоне падзей у рэгіёне разумееш — галоўнае, што нам удалося прайсці ўсе складаныя гістарычныя часы і пры гэтым захаваць мір і спакой. І гэта, як сведчаць тыя ж архіўныя кадры, фатаграфіі, старыя газеты, і ёсць звышідэя нашай беларускай мадэлі паводзін. Безумоўна, бывалі цяжкія часы, але нам удалося іх пераадолець, перажыць, і цяпер на нашай зямлі спакойна. Так атрымалася, што мы знаходзімся ў цэнтры кантынента, і пры такіх умовах не быць паміж усіх агнёў немагчыма. І беларуская місія міру, якую мы ўсклалі на сябе, вынікае ў тым ліку з тых крокаў, што наша краіна рабіла на працягу свайго існавання. Спадзяюся, я змагу гэта паказаць у сваёй серыі цыкла. Калі на прыкладзе югаслаўскай трагедыі, з дапамогай архіваў, размоў з сучаснымі сербамі, якія памятаюць тыя падзеі, зможам убачыць гісторыю ў іншым святле.

***— У працэсе працы што вас асабліва здзіўляла і якія пытанні задавалі сабе?***

— Пытанні ўзнікаюць кожны дзень. І я тэстую ўласныя ўспаміны дакументамі, бо нешта ўсё ж такі забываецца, нават калі дакладна ведаеш, як было, то не пашкодзіць пераправерыць сваю правату. Ты глядзіш на тое, што адбываецца, пад адным вуглом, плюс эмоцыі, стаўленне да падзеі, якія накладваюцца, і таму не заўсёды ўдаецца заставацца абсалютна аб'ектыўным. На штосьці ў цябе сфарміравана канкрэтнае бачанне, а пераправерыўшы, здзіўляешся, як часам карэктуецца твой пункт гледжання.

***— Як вы ставіцеся да спроб, скажам так, перагляду гісторыі?***

— Маё пакаленне памятае якраз тую сітуацыю, калі на працягу года змянілася тры падручнікі па гісторыі. Імгненна даводзілася перавучваць усё, перапісвалася праграма. А мы ўжо вучыліся глядзець інфармацыю ў розных кніжках, чыталі дадатковыя артыкулы па зададзенай тэме... Таму любая спроба фальсіфікаваць гісторыю падштурхоўвае мяне сядаць за кнігі, вывучаць факты, каб дайсці да ісціны.

***— Мабыць, не проста і ў камандзе працаваць? Думаю, часам трэба адмаўляцца ад уласнага бачання, прыслухоўвацца да калег?***

—Тэлебачанне — заўсёды калектыўная праца. І, зразумела, у пэўны момант сустракаеш чалавека, які глядзіць на рэчы зусім інакш, чым ты. Тут не застаецца іншага выйсця — толькі дамаўляцца. Спрэчак хапае, але ўсе яны канструктыўныя. Бо сам праект задумваўся як погляд каманды. А глядач ужо самастойна будзе рабіць высновы.

**Алена ДРАПКО.**

*drapko@zviazda.by*










**P. S. Глядзіце новы праект «Беларусь XXI» у эфіры тэлеканалаў «Беларусь 1» і «Беларусь 24» кожную нядзелю ў рамках праграмы «Галоўны эфір».**



■ На экране

# НАЗАД У БУДУЧЫНЮ

## Марці МакФлай вяртаецца ў кінатэатры

**Нядаўна стала вядома, што сталічны кінатэатр «Масква» ў кастрычніку пакажа культавы фантастычны фільм 1980-х «Назад у будучыню» і Марці МакФлай усміхнецца нам з вялікага экрана.**



Гэта ўжо другое вяртанне класічнага папулярнага фільма ў мінскую афішу. У чэрвені прайшло чатыры кінасеансы ў тым жа кінатэатры «Масква», на якіх паказваўся адрэстаўраваны «Тэрмінатар» Джэймса Кэмерана (рэжысёра такіх фільмаў, як «Чужыя», «Тытанік», «Аватар»), таксама фільм 1980-х гадоў. У Мінску ён карыстаўся нязменнай папулярнасцю і пры ўмяшчальнасці ў семсот чалавек зала збірала каля чатырохсот гледачоў. Так за сталічны вяяж «Тэрмінатар» сабраў больш за 80 мільёнаў рублёў.

Вяртанне на экраны фільма «Назад у будучыню» Роберта Земекіса (рэжысёра фільмаў «Хто падставіў кроліка Роджэра?», «Ізгой» і аскараноснай карціны «Форэст Гамп») невыпадковае. У другім фільме франшызы галоўны герой з 1985 года трапляе... у 21 кастрычніка 2015 года. Таму на гэтую дату студыя Universal запланавала паўторны паказ дзвюх легендарных карцін (трэцяя частка па невядомых прычынах у праграме не ўдзельнічае). Акрамя іншага, стужкі «Назад у будучыню» ў гэтым годзе спаўняецца трыццаць гадоў пасля сусветнай прэм'еры. Першы фільм будзе паказваць у «Маскве» 21, 22 і 24 кастрычніка, другі — 21, 23 і 25 на мове арыгінала з рускімі субцітрамі.

Дзеянне фільма Роберта Земекіса развіваецца ў звычайным амерыканскім горадзе, звычайнай школе, звычайнай, магчыма, у нечым тыповай, амерыканскай сям'і. Толькі адбываюцца тут незвычайныя рэчы дзякуючы двум незвычайным персанажам. Самы відавочны «фрык» у фільме — гэта доктар Эмет Браўн, які ўжо трыццаць гадоў працуе над машынай часу і нарэшце яе стварае. Права паглядзець першую дэманстрацыю атрымлівае яго сябар — старшакласнік Марці МакФлай. Але ў гэты момант на плошчы, дзе стаіць тая самая, ужо легендарная, спартыўная машына «DeLorean» з дзвярыма «крыло чайкі», дзеянне становіцца ўсё больш насычаным. Раптоўна з'яўляюцца тэрарысты, якія хочуць «дастаць» дока Браўна...

Марці МакФлай трапляе ў мінулае, дзе кантактуе са сваімі бацькамі-старшакласнікамі і маладым Браўнам. Тут ён павінен узяць усё ў свае рукі і здолець паўплываць на сучаснасць такім чынам, каб змяніць сваю будучыню...

Смелы і рашучы падлетак Марці МакФлай і ў другім фільме ліха падарожнічае ў часе, каб дапамагчы сваім дзецям і не дапусціць перамогі несправядлівасці. Так легендарныя Марці МакФлай і доктар Браўн прыйдуць на вялікі экран Мінска.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■

## ПЯТНІЦА, 14 ЖНІЎНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 19.55 Серыял «Доўгі шлях дадому».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 1.50 Дэтэктыў «Выходжу цябе шукаць».**
**17.35** Беларусь XXI.
**17.50, 21.40** Зроблена ў Беларусі.
**18.10** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**21.00** Панарама.
**21.55 Меладрама «Пакліч, і я прыйду».**
**1.35** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.35** Тэлебарометр.
**9.05, 16.10 Серыял «Каўчэг».**
**10.35** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**11.50** Дак. цыкл «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**12.50 Серыял «Косці».**
**13.45** Капейка ў капейку.
**14.20 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**17.55 Серыял «Участковая».**
**18.55 Баявік «Драпежнікі».**



**20.45** Хачу ў тэлевізар!
**21.00** Рэальны свет.
**21.40** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.45** «Бітва экстрасэнсаў. Барацьба кантынентаў». Заключны выпуск.
**23.40** Рэпарцёр.
**0.25 Трылер «Прывіды».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.25** «Дабрананак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!»
**8.00** М/ф.
**8.30, 13.00, 17.50, 2.00** «Калейдаскоп».
**8.40 «Дастаеўскі». Драма. Заключная серыя.**
**9.35** «Майстэрня на набярэжнай». Дак. фільм.
**10.05 «Вясёлыя Расплюеўскія дні». Камедыя.**
**11.30 «Чапаеў». Драма.**
**13.10** «Русь былинная». Канцэрт казачага ансамбля «Атаман».
**14.50 «У стылі jazz». Меладрама.**
**16.20** «У гасцях у Барыса Аверына». Сустрэча з протаіерэем, філолагам і лінгвістам айцом Сергіем.
**17.10** «...І пра нешта іншае». Дак. фільм.
**18.00 «Вясёлыя Расплюеўскія дні». Камедыя.**
**19.25 «Мужчыны сівеюць рана». Драма.**
**20.45** «Калыханка».
**21.00, 23.10** «Камертон». Народная артыстка Беларусі Людміла Корхава.
**21.30 «Місіс Браўн». Драма.**
**23.35 «Хрусталёў, машыну!» Драма.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 7.35, 1.15** PRO спорт. Навіны.
**7.15, 17.05** Спорт-мікс.
**7.55** Тэніс. Турнір ВТА. Таронта.
**12.00** Мастацкая гімнастыка. Кубак свету. Будапешт.
**14.30, 20.25** Бокс. Чэмпіянат Еўропы. Паўфіналы.
**17.25** Піт-стоп.
**17.55** Свет англійскай прэм'ерлігі.
**18.25** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «ФК Гомель» — БАТЭ (Барысаў).
**22.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Другі тур. «Астан Віла» — «Манчэстэр Юнайтэд».
**0.20** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10 Серыял «Дом з ліліямі».**
**16.20** «Вучыцца жыць».
**16.50** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Аднакласнікі».**
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Цудатворац».**
**23.00 Маст. фільм «Давай зробім гэта па-хуткаму».**
**0.45** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Д'ябал і Дэніэл Уэбстэр».**
**10.15** «Далёкія сваякі».
**10.40 Серыял «Салдаты 8».**
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.35** «Не хлусі мне!»
**13.50** «Татальны распродаж».
**14.45, 23.00 Серыял «Жаданая».**
**16.50** «Ля парадняга пад'езда».
**17.35** «Званая вячэра».
**18.30** «Тайны нашай планеты»: «Калі грыбы плачуць».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Спатканне маёй мары».**



**22.10** «Глядзець усім!»
**0.25** «Вялікая гульня». Покердуэль.
**1.10 Трылер «Клетка».**

### МІР

**6.00 Серыял «Рускія амазонкі».**
**8.35** Дак. серыял «Прыгажосць на заказ».
**9.00** «Зроблена ў СССР».
**9.30 Маст. фільм «Інспектар ДАІ».**
**11.00 Маст. фільм «Маўчун».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20** Дак. серыял «Давайце разбяромся!».
**14.15, 3.10 Серыял «Мужчына ўва мне».**
**16.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**16.50 Серыял «Па імені Барон».**
**19.25 Серыял «Беды-радасці Надзеі».**
**22.50 Маст. фільм «Сем нявест яфрэйтара Збруева».**
**0.40 Маст. фільм «Элвіс пакінуў будынак».**
**2.25 Серыял «Час кахаць».**
**5.00** М/ф.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30, 17.10** «Генерал Кінжал, або Зорныя гадзіны маршала Ракасоўскага».
**12.25 Маст. фільм «Гардэмарыны, наперад!».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.

**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**18.00 Серыял «Апошні янычар».**
**21.00** «Асаблівы выпадак».
**22.00, 23.10** «Ізмайлаўскі парк».
**0.00 Маст. фільм «Вальс-Бастон».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Сонечна. Без ападкаў».
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.45** «Справа густу».
**15.15, 16.25 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**19.40 Серыял «Настаўнік у законе. Вяртанне».**
**22.55 Серыял «Пятніцкі. Глава трэцяя».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.15, 21.05, 23.25** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.20, 19.20 Серыял «Скандал».**
**8.45, 18.30 Серыял «Каварныя пакаёўкі».**
**9.30, 10.45, 13.50, 14.55, 15.45, 19.05, 21.00** «Хатняя крама».
**9.45** Дак. серыял «Генералы супраць генералаў».
**10.35** «Кінаблакнот».
**11.00 Трылер «Цана страху».**
**13.10 Серыял «Страла».**
**14.10** Дак. серыял «Гісторыя кантынента».
**15.00 Серыял «Рабыня Ізаўра».**
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Сотня».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Трылер «Va-банк».**
**23.05 Серыял «Байкі са склепа».**
**23.30** «Хобі TV».

### ВТБ

**6.00, 5.20** «PLAY».
**7.00, 13.00** «Ералаш».
**7.30, 15.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 17.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 23.05, 2.00, 4.30** Скетчшоу «Даеш моладзь».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Васьмідзясятыя».
**10.00, 19.00** Серыял «Апошні з Магікян».
**11.00** Баявік «Прыроджаны гоншчык».
**13.30** Серыял «Дочкі-маці».
**14.30, 3.00** «Ведаць будучае. Жыццё пасля Вангі».
**16.00** Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».
**17.00, 5.00** «Лаві момант».
**20.00, 1.00** «Уральскія пельмені».
**21.10** Меладрама «Сямейка Джонсаў».
**0.30, 4.00** «Дурні і дарогі».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.00** Навіны культуры.
**10.20** Шэдэўры старога кіно. «Наследны прынц рэспублікі». Маст. фільм.
**11.40** «Каміль Пісаро». Дак. фільм.
**11.50** «Правілы жыцця».
**12.15** «Пісьмы з правінцыі». Сяло Учма (Яраслаўская вобласць).
**12.45** Ілюзіён. «Сантыментальная гарачка». Фільмы Якава Пратазанава. «Падайце, богам прашу, ёй», «Волат духу (Паразіты жыцця)».
**14.20** Замежная справа. «Ад Генуі да Мюнхена».
**15.10** «Надзея Казанцава. Парадоксы лёсу». Дак. фільм.
**15.35** «Паліглот». Вывучым французскую за 16 гадзін! № 8.
**16.25** Да юбілею акцёра. Веніямін Смехаў у тэлеспектаклі «Месье Ленуар, які...» Запіс 1983 года.
**19.15** Смеханастальгія. Таццяна Пельтцэр.
**19.50, 1.55** «Шукальнікі». «Скарбы каломенскіх падзямелляў».
**20.35** «Сябар мой, Колька!..» Маст. фільм.
**22.05** «Лінія жыцця». Мікіта Сіманян.
**23.15** Мастсавет.
**23.20** «Дынастыя без грыму». Глава шостая, заключная.
**0.05** «Царазабойца». Маст. фільм.
**1.45** «Pro memoria». «Асновы і Сувязь».
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Тэатральны раман». 1-я частка. Маскоўскія тэатры ў 60-я гады.
**7.00** Маст. фільм «Дзе ты, Багіра?»
**8.10, 9.40, 10.55, 11.40, 12.30, 15.40, 16.55, 17.40, 21.40, 23.15, 3.40, 4.55** Музычная настальгія.
**8.35** М/ф «Калі запальваюцца ёлкі».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.30, 17.30, 5.40** «Сядзі і глядзі». 2005 год.
**12.00** Дак. фільм «Аляксандр Разенбаум. Твар у твар».
**13.00** Маст. фільм «Доўгія праводзіны».
**14.40** М/ф «Дзядуля і ўнучак».
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1974. 1-я частка. Паўтор ад 2011 года.
**19.10** Маст. фільм «Дзве версіі аднаго сутыкнення».
**20.45** М/ф «Машачкін канцэрт».
**22.00** Юбілейны канцэрт групы «Земляне». 2008 г.
**0.00** Дак. фільм «Галіна Вішнеўская. Вяртанне».
**1.00** Маст. фільм «Двое пад адным парасонам».
**2.35** М/ф «Шэрая Шыйка».

### EUROSPORT

**4.00, 7.00, 9.30, 12.30, 15.00, 0.15** Веласпорт. Тур Бенілюкса.
**5.00, 10.30, 14.30, 18.00, 23.30** Веласпорт.
**6.00, 8.00, 11.30, 22.00, 2.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры.
**13.30** WATTS.
**19.00** Футбол. «Olympique Lyonnais» (Францыя) — «Цюрых» (Швейцарыя).
**20.00** Футбол. ПСЖ (Францыя) — «Баварыя Мюнхен» (Германія).
**1.30** Наймацнейшыя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.35, 18.00, 22.00, 3.30** Серыял «Нумар адзін спадар Кхан».
**6.35** Камедыя «Снежная нявеста».
**8.00** Камедыя «Калядная пяцёрка».
**10.40** Камедыя «Каханне з перашкодамі».
**12.30** Камедыя «На здрадзе».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.10, 20.05, 0.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Двое — гэта занадта».
**18.35** Камедыя «Трайныя непрыемнасці».
**20.20** Камедыя «Дзве калядных сабакі».
**23.10** Камедыя «Круты татачка».
**1.15** Камедыя «Каханне з акцэнтам».
**3.00** Серыял «Прападобны».
**4.00** Баявік «Няўдачнікі».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.20** «Дачныя гісторыі».
**7.45, 18.50, 2.10** Серыял «Забароненае каханне».
**9.20, 3.40** Дак. серыял «Судовыя страсці».
**10.10, 4.25** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.05, 16.45** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.00, 15.50** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**12.50, 17.45** Серыял «Тайны следства».
**13.50** «Простыя складанасці».
**14.20, 23.00** «Зорныя гісторыі».
**15.15, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**20.40** Камедыя «Місіс Даўтфайр».
**23.45** «Гісторыі выратавання».
**0.15** Маст. фільм «Вялікі Лябоўскі».

### ТБ1000

**6.20** Драма «Шляхі і путы».
**8.10** Драма «12 гадоў рабства».
**10.20, 1.50** Жахі «Воўк».
**12.30** Трылер «Ілюзія падману».
**14.30, 23.40** Меладрама «Бурлеск».
**16.40** Жахі «Жанчына ў чорным».
**18.20** Камедыя «Нагледзеўшыся дэтэктываў».
**20.00** Драма «Язмін».
**21.40** Камедыя «1+1».
**4.00** Камедыя «Міс Кангеніяльнасць II: выдатная і небяспечная».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Камедыя «Мільён у шлюбным кошыку».
**7.55** Драма «Паляванне на Вярвольфа».
**9.55** Драма «Гарпастум».
**12.00** М/ф «Тры волаты і Шамаханская царыца».
**13.20** Драма «Мой сябар Іван Лапшын».
**15.00** Меладрама «Выключэнне з правілаў».
**16.35** Трылер «Вій 3D».
**18.50** Камедыя «Спакаванья».
**20.20** Баявік «Спіраль».
**22.05** Трылер «Стальны матылёк».
**23.50** Драма «Гульні матылькоў».
**1.35** Драма «Гідраўліка».
**3.25** Баявік «Небяспечныя гастролі».
**4.55** Камедыя «Пісталет Страдывары».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 11.50** Скарбашукальнікі.
**6.50, 8.05, 23.00, 3.10** Навуковыя недарэчнасці.
**7.15** Зрабі або памры.
**8.30, 13.30, 19.20** Будаўнічая ліхаманка.
**9.20, 14.20, 20.10** Незвычайныя здабычы.
**10.10, 16.50, 3.40** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**11.00** Мегазаводы.
**12.40** Папулярная навука.
**13.05** Гульні розуму.
**15.10** Тайна марскога д'ябла.
**16.00** Зграя.
**17.40, 21.00, 1.10, 4.30** На плытах па Юкане.
**18.30, 21.50, 2.00, 5.15** Золата Юкана.
**22.40, 2.50** Код небяспекі.
**23.30** Расследаванні авіякатастроф.
**0.20** Эвакуацыя Зямлі.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўладкавана?
**8.50, 11.20** Праз магію да зорак.
**9.40, 13.50** Дом для аўто.
**12.10, 18.00** Бітва за нерухомасць.
**13.00, 0.40, 6.24** Акварыумны бізнес.
**14.40, 5.36** Разбуральнікі легенд.
**16.20, 4.00** Аўтальянцы.
**17.10, 4.48** Махінатары.
**18.50** Дарожныя каўбоі.
**19.40** Смяротны ўлоў.
**20.30** Ледзяное золата.
**22.10** Інжынерыя немагчымага.
**23.00** Перш за ўсё — самалёты.
**23.50** Скіўцы наносяць удар у адказ.
**1.30, 7.12** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.
**3.10** Паляўнічыя на склады.

■ Тэма

# ПЕРСПЕКТЫВЫ КІЛАВАТА

## Энергетычны рынак краіны чакаюць змены

**Чаму атамныя электрастанцыі бяспечнейшыя за звычайныя цеплавыя? Як хутка будзе створаны адзіны энергетычны рынак краін ЕАЭС? Якія істотныя праблемы мае так званая «зялёная» выпрацоўка кілаватаў? Аб гэтым гаворка ішла на круглым стале, прысвечаным узаемадзеянню Беларусі і Расіі ў сферы энергетыкі.**

### «ХІБА ХТОСЬЦІ АГІТАВАЎ ЗА СПЫНЕННЕ ЦЕПЛАВЫХ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЙ?»

Сіндром радыёфобіі ўласцівы многім жыхарам краіны вось ужо амаль 30 гадоў пасля выбуху на Чарнобыльскай АЭС. Але аказваецца, што звычайныя цеплавыя электрастанцыі маюць на сваіх рахунках куды больш жыццяў, чым атамныя.

— Хочам мы сёння таго або не, але сёння рэальную альтэрнатыву цеплавому спосабу атрымання энергіі ўяўляюць з сябе гідра- і атамныя электрастанцыі, — лічыць **намеснік Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Аляксей КУБРЫН.** — У даччыненні да апошніх вельмі шмат гаворыцца пра экалагічны складнік і бяспеку людзей. Я прывяду некалькі лічбаў. Неўзабаве пасля аварыі на ЧАЭС пры Акадэміі навук у Расіі запрацаваў спецыяльны інстытут, які якраз займаецца праблемамі бяспечнай эксплуатацыі атамных электрастанцый. І за гэты час ён сабраў цікавую статыстыку. Аказваецца, няшчасныя выпадкі на цеплавых электрастанцыях забралі жыцці каля 18 тысяч чалавек. За той жа час ад трагедый у атамнай энергетыцы загінула каля 800 чалавек, і гэта з улікам Чарнобыля і яго мяркуемых ахвяраў. Гэта сведчанне таго, што экалагічная і агульная бяспека атамнай энергетыкі на парадак вышэйшая за тую, якая існуе на звычайных электрастанцыях. Сістэмы і ўзроўні абароны на такіх аб'ектах вельмі высокія. Тым не менш хіба хтосьці ў свеце выходзіў на вуліцы з лозунгамі кшталту: «Спынім эксплуатацыю цеплавых электрастанцый, перапынім здабычу вугалю?» А вось калі адбылася сумныя падзеі на Фукусіме, то дэманстрацыі супраць атамнай энергетыкі былі...

### У ЕАЭС ЗАПРАЦУЕ АДЗІНЫ ЭНЕРГЕТЫЧНЫ РЫНАК

Як зазначыў Аляксей Кубрын, стварэнне адзінай энергасістэмы Беларусі і Расіі — гэта адзін з краевугольных камянёў узаемадзеяння ў Саюзнай дзяржаве. Гэтую задачу паставілі міністэрствы прамысловасці, энергетыкі, эканомікі абедзвюх краін. Найперш неабходна ўніфікаваць нарматыўную базу і існуючыя тэхналогіі.

— Аб адзіным рэальным энергетычным рынку пакуль гаварыць даволі складана, — мяркуе **першы намеснік міністра энергетыкі Беларусі Леанід ШАНЕЦ.** — Сёння гэтая тэма актыўна абмяркоўваецца экспертамі з абодвух бакоў. Разам з тым адзіны энергетычны рынак павінен запрацаваць ужо з 2019 года. Таму ў найбліжэйшы час пытанні, звязаныя з ім, можна вырашыць.

### ПАДВОДНЫЯ КАМЯНІ «ЗЯЛЁНАЙ» ЭНЕРГЕТЫКІ

Апошнім часам мы вельмі шмат чуем пра імклівае развіццё ў Заходняй Еўропе ветракоў і сонечных электрастанцый. На першы погляд, гэты спосаб атрымання кілаватаў вельмі экалагічны — не трэба спальваць арганічнае паліва, ды і няма патрэбы ў стварэнні такой колькасці ўзроўняў бяспекі, як на АЭС. А калі прыглядзецца больш уважліва?

— У Беларусі пабудавана 6 сур'ёзных па магутнасці біягазавых комплексаў, у асноўным іх магутнасць не перавышае 1 МВт/г, — паведаміў **намеснік акадэміка-сакратара Аддзялення фізіка-тэхнічных навук, акадэмік НАН Беларусі Аляксандр МІХАЛЕВІЧ.** — Працуюць і 37



ветраўстановак магутнасцю да 1,5 МВт. Менш за год таму на поўную магутнасць была запушчана сонечная электрастанцыя ў Бабруйску на 2 мегаваты. Але вопыт эксплуатацыі аднаўляльных крыніц энергіі вымушае прызадумацца. Так, сабекошт выпрацоўкі электрычнасці на іх меншы дзякуючы адсутнасці паліўнага складніку, за выключэннем біягазу.

Ветравыя ж і сонечныя электрастанцыі маюць вельмі вялікі зыходны недахоп, які заключаецца ў малым каэфіцыенце выкарыстання магутнасцей. Напрыклад, узімку светлавы дзень вельмі кароткі, і ад сонца шмат энергіі атрымаць ужо не ўдасца. А выпрацоўку энергіі на ветравых станцыях зніжае штыль. Энергетыка на аднаўляльных крыніцах развіваецца ў многім за кошт таго, што для продажу электраэнергіі ў агульную сетку ўстаноўлены павышаныя каэфіцыенты, якія садзейнічаюць яе акупляльнасці. Сумарная магутнасць усіх аднаўляльных крыніц, у тым ліку і гідраэлектрастанцый, зараз у агульным энергетычным балансе невялікая — усяго 0,7%. І пакуль што гэта не сказваецца на кошце кілавата. Але калі яна будзе развівацца і надалей і яе доля наблізіцца, скажам, да 10%, паўстане пытанне: што рабіць з гэтымі каэфіцыентамі? Дадатковыя выдаткі лягуць на плечы або бюджэту, або спажыўцоў электраэнергіі. Бюджэты дзяржаў Заходняй Еўропы, напрыклад, маюць магчымасць такой кампенсацыі. А як будзе ў нас? Мала хто захоча атрымліваць рахункі за электрычнасць, большыя ў разы. І таму ўсё роўна развіццё «зялёнай» энергетыкі давядзецца рэгуляваць або з дапамогай квот, або змяненне каэфіцыентаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**
*schklennik@zviazda.by*

■ Факт

# ДЗІЦЯЧЫ «АКЦЭНТ»

**Для жыхароў новага гродзенскага мікрараёна Альшанка адкрылі чарговы сацыяльны аб'ект — аптэку.**

Яна размясцілася на вуліцы Агінскага побач з амбулаторыяй дзіцячай палiклінікі, і таму акцэнт зрабілі на тавары дзіцячага асартыменту — гэта і лекавыя сродкі, і біялагічна актыўныя дабаўкі, і медыцынская тэхніка, і харчовыя вырабы. Дзіцячую тэматыку выкарысталі нават у афармленні гандлёвай залы. Уваход для зручнасці наведвальнікаў абсталявалі пандусам з поручнем.

— Аптэка прапануе бацькам усё, што неабходна для здароўя дзяцей і іх догляду, — зазначае **намеснік генеральнага дырэктара Гродзенскага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Фармацыя» Таццяна ЗАРЭЦКАЯ.** — Пры гэтым дзейнічае сістэма цэнавых знiжак. Пяціпрацэнтную зніжку прадастаўляюць пры набыцці лекавых сродкаў айчыннай вытворчасці цяжарным жанчынам, шматдзетным сем'ям, дзецям да трохгадовага ўзросту, пенсіянерам, інвалідам, удзельнікам вайны і іншым асобам, якія маюць права на льготы. Такая ж зніжка прадугледжана для ўсіх кліентаў, калі кошт пакупкі адначасова перавышае 250 тысяч рублёў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*






■ Рабочыя рукі

# ШЫРОКІ ПРОФІЛЬ

## Сёння ў прыярытэце спецыялісты, якія валодаюць адразу некалькімі кампетэнцыямі

**У прафесійна-тэхнічных навучальных установах нашай краіны працягваецца прыёмная кампанія. Прыём вядуць <u>185 устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі, якія прапануюць маладым людзям амаль 300 прафесій</u>. Акрамя таго, набор для навучання па рабочых прафесіях ажыццяўляе 31 сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З улікам патрэб галін эканомікі, дэмаграфічнай сітуацыі і вынікаў працаўладкавання выпускнікоў **аб'ёмы прыёму засталіся на ўзроўні мінулага года — 34,8 тысячы чалавек.** Для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі на дзённай форме навучання плануецца залічыць 32,3 тысячы чалавек, у тым ліку на аснове агульнай базавай адукацыі — 20 тысяч, на аснове агульнай сярэдняй адукацыі — 11,5 тысячы і на аснове спецыяльнай адукацыі — 800 чалавек. На завочную форму навучання мяркуюць прыцягнуць 1,1 тысячы чалавек і 1,4 тысячы — на вячэрнюю форму навучання. На завочную форму прымаюцца асобы, якія маюць агульную базавую або агульную сярэднюю адукацыю і кваліфікацыю рабочага, але не маюць дакумента аб прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Па словах **міністра адукацыі Міхаіла ЖУРАЎКОВА,** свабодныя месцы ў прафесійна-тэхнічных установах запаўняюцца нядрэнна. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца ў маладых людзей такія спецыяльнасці, як «аўтамабілебудаванне», «аўтамеханік», «аўтасэрвіс», «кухар», «кандытар», «цырульніцкае мастацтва». Менш ахвотна абітурыенты нясуць дакументы ва ўстановы, дзе рыхтуюць кадры для лёгкай прамысловасці. Увогуле спецыяльнасці, звязаныя з лёгкай прамысловасцю, дрэнна запаўняліся сёлета і ў ВНУ.

Міністр адукацыі з задавальненнем адзначыў, што цікавасць да рабочых прафесій з боку моладзі расце. Сказаць, чым рабочая спецыяльнасць адрозніваецца ад спецыяльнасці, атрыманай у сярэдняй спецыяльнай ці нават вышэйшай навучальнай установе, цяпер досыць складана, бо мяжа паступова сціраецца. Ёсць прафесіі, дзе рабочаму хапае прафесійна-тэхнічнай адукацыі, але ёсць і такія, і іх становіцца ўсё больш, дзе ад рабочага персаналу патрабуецца наяўнасць сярэдняй спецыяльнай і нават вышэйшай адукацыі. Заказчыкі кадраў настойваюць на тым, што ў сувязі з шырокамаштабнай мадэрнізацыяй у прамысловасці ім сёння патрабуюцца спецыялісты, якія валодаюць адначасова некалькімі кампетэнцыямі, гэта значыць спецыялісты, якія могуць не толькі выконваць пэўныя аперацыі на абсталяванні, але і абслугоўваць яго. Патрабуюцца кадры для інавацыйных тэхналогій.

У апошнія тры гады з улікам патрабаванняў рэгіянальных рынкаў працы была адкрыта падрыхтоўка па новых кваліфікацыях. Гэта аператар часальнага абсталявання, аператар аўтаматызаванага раскройнага комплексу, аператар аўтаматызаванага насцілачнага комплексу, вытворца марожанага, аператар механізаваных і аўтаматызаваных складоў, агент па арганізацыі абслугоўвання аўтамабільных перавозак.

Прыём дакументаў на дзённую форму навучання **будзе доўжыцца ў прафесійна-тэхнічных навучальных установах па 20 жніўня. Калі будуць заставацца вакантныя месцы, прыём дакументаў можа быць падоўжаны да 15 верасня.** Для атрымання прафесіі **ў завочнай форме** прыём будзе праходзіць **з 1 па 10 кастрычніка.**

Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія вырашылі паступаць у беларускія ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі на платнай аснове, могуць падаць заявы для прыёму па 10 верасня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**по объекту «Многоквартирные жилые дома № 11, 12, 13, 14 по генплану в районе пересечения улиц Проектируемой №1, Проектируемой №2 в границах жилого района «Лебяжий». Дом № 14 без инженерных сетей».**

**Сведения о застройщике.**

Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома № 2292 от 18.11.2004 зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580566.

**Юридический адрес:** 220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 3, Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет КУП «УКС Центрального района г. Минска» построены и введены в эксплуатацию объекты:

- жилой дом № 20 по ул. Камайская;
- жилой дом № 12 по ул. Камайская;
- жилой дом № 15 по ул. Ратомская;
- жилой дом № 16 по ул. Мястровская;

Цель проекта – строительство жилого дома № 14 по генплану в составе объекта «Многоквартирные жилые дома по г/п № 11, 12, 13, 14 в районе пересечения улиц Проектируемой №1, Проектируемой №2 в границах жилого района «Лебяжий» общей площадью 12,3 тыс. кв.м., в том числе общая площадь квартир – 10,4 тыс. кв.м.

**Вид строительства**: новое строительство.

**Начало строительства –** 8 сентября 2014 года.

**Окончание строительства –** ноябрь 2015 года.

**Проектные решения:** Жилой дом запроектирован 9-этажным 4-секционным, всего квартир – 162, в том числе однокомнатных – 36 шт., двухкомнатных – 72 шт., трехкомнатных – 54 шт. Секции оборудованы лифтами на 630 кг со скоростью 1,0 м/с и мусоропроводом. В техническом подполье запроектированы помещения для инженерного обслуживания дома – помещение ИТП и электрощитовая. Входы в техподполье выполнены непосредственно снаружи. При входных группах в каждую секцию предусмотрено место для пандуса. Конструкция здания – монолитный каркас со стенами с плоскими монолитными перекрытиями. В квартирах, расположенных на 6-м этаже и выше, предусмотрено устройство вторых эвакуационных выходов на лоджию с глухим простенком от торца лоджии и балкона до оконного проема не менее 1,2 м.

Наружная отделка – атмосферостойкие штукатурки с последующей окраской фасадными красками; облицовка конструкций приямков и крылец плитами искусственного камня.

Окна, витражи остекления лоджий – из профилей ПВХ.

Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу, получено положительное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 21.06.2010 № 671-15/10. Участок площадью 0,7073 га передан КУП «УКС Центрального района г. Минска» решением Мингорисполкома от 13.03.2014 № 591(1) (до 1 августа 2015 года).

Получено разрешение на организацию стройплощадки Госстройнадзора от 08.09.2014 № 2-209Ж-031/14. Получено разрешение Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску на производство работ от 26.09.2014 №2-209Ж-031/14.

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 7,8% общей площади жилого дома.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

33 квартиры по цене за 1 м² жилья на дату опубликования проектной декларации при оплате по графику:

1 200 (1151*) долларов США по курсу Нацбанка на день оплаты за 1 м² двухкомнатной квартиры;

1 151 (1100*) доллар США по курсу Нацбанка на день оплаты за 1 м² трехкомнатной квартиры.

*Стоимость 1 кв.м. при **единовременной** оплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства.

**Условия оплаты –** первоначальный взнос в размере 50% стоимости объекта долевого строительства (при оплате по графику) в течение 10 (Десяти) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма оплачивается до окончания строительства в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору. При единовременном платеже – 100% стоимости объекта долевого строительства – в течение 15 (Пятнадцати) календарных дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

Оплата цены объекта долевого строительства (цены договора) исполняется в белорусских рублях в сумме, эквивалентной определенной сумме в иностранной валюте. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к соответствующей иностранной валюте, установленному Национальным банком на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не установлены законодательством или договором.

**Для заключения договоров необходимы:**

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Документы для заключения договоров будут приниматься с 13.08.2015 г. Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (Пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по телефону: 306-07-26.

*С момента опубликования проектной декларации утрачивает силу проектная декларация, опубликованная в газете «Звязда» от 11.02.2015 года №26 (27884).*

УНП 190580566

---

В суд Мозырьского района Гомельской области поступило заявление о признании умершим гражданина **ХАРЛАНЧУКА Владимира Михайловича,** 27 октября 1967 года рождения, уроженца г. Мозырь Гомельской области, проживавшего по последнему известному адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, б-р Юности, 12, кв. 110.

**Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Мозырьского района Гомельской области имеющиеся сведения о ХАРЛАНЧУКЕ В.М. в течение 2-х месяцев с момента публикации.**

---

Открытое акционерное общество «Строительный трест № 4»

**сообщает о проведении**
**ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**
**ОАО «Стройтрест №4».**

**Собрание состоится 20 августа 2015 года в 16:00 по адресу:**
г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, актовый зал

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

